**УДК 94(476)«ХХ»**

# ДЗЯРЖАЎНА-ПАЛІТЫЧНАЯ ТРАДЫЦЫЯ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў НАЦЫЯНАЛЬНЫХ РУХАХ ЯГО ПРАВАПЕРАЕМНІКАЎ У ПАЧАТКУ ХХ СТАГОДДЗЯ

***С.П. МАРОЗАЎ***
***(Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы)***

*Разгледжаны пошукі беларускай, літоўскай і польскай палітычнай думкі пачатку ХХ ст. форм нацыянальна-дзяржаўнага ўладкавання народаў былога ВКЛ на аснове яго дзяржаўна-палітычнай традыцыі. Усталяваны абставіны звароту да гістарычнай традыцыі. Ахарактарызаваны месца і роля традыцый ВКЛ у "краёвай" ідэалогіі, ідэалогіі літоўскіх аўтанамістаў, польскіх федэралістаў, беларускага нацыянальнага руху. Выяўлена тэндэнцыя да дыферэнцыяцыі інтарэсаў нацый краю і прыстасавання імі спадчыны ВКЛ да сваіх інтарэсаў, канкурэнцыі з-за гэтай спадчыны.*

*Навуковая навізна месіцца ў метадалагічным падыходзе, што грунтуецца на сучасных канцэпцыях (сацыякультурнай траўмы; палітычнай нацыі; нацыяўтварэння ва Усходняй Еўропе, разгледжанага праз феномен спадчыны Рэчы Паспалітай і ВКЛ); правядзенні параўнаўчага аналізу практыкі выкарыстання спадчыны ВКЛ беларускімі, літоўскімі і польскімі нацыянальнымі рухамі і выкрыцці спецыфікі ідэалогіі беларускага руху; прыцягненні новых архіўных крыніц.*

**Уводзіны.** Паўстанне 1863 г. было апошняй адчайнай спробай ліцвінскай (літоўскай і беларускай) шляхты ўзброеным шляхам адрадзіць інстытуты і традыцыі Вялікага Княства Літоўскага. Ідэалогія беларускага і літоўскага грамадскага-палітычнага руху, які пасля эпохі пасляпаўстанцкіх рэпрэсій і стагнацыі адрадзіўся ў новых пакаленнях змагароў, вуснамі сваіх нацыянальных лідараў заявіла аб новым дзяржаўна-палітычным ідэале – аўтаноміі для Беларусі і для Літвы ў складзе дэмакратычнай Расіі. Нацыі пачыналі ўсведамляць сябе і свае ўласныя інтарэсы. Здавалася, ідэя адбудовы ВКЛ, аб чым марыла некалькі папярэдніх пакаленняў, назаўсёды адышла ў нябыт. Але грунтаваная на гістарычным праве яго народаў-правапераемнікаў, яна вяртаецца ў пачатку ХХ ст., каб яшчэ два дзесяцігоддзі бударажыць думкі мысляроў і палітыкаў.

Гісторыя змагання за працяг дзяржаўна-палітычнай традыцыі ВКЛ нашмат цясней звязана з беларускай сучаснасцю, чым большасць людзей гэта ўсведамляе. Як сцвярджае сучасны амерыканскі гісторык Т. Снайдар, даследчык нацыянальных мадэляў развіцця народаў Усходняй Еўропы, і ў ХХ ст. ВКЛ заставалася "ўніверсальным пунктам адліку" для беларускіх дзеячаў, якія азіраліся на гісторыю ў пачатку стагоддзя, у 1939 г. і нават у пачатку 1990-х гг. [1, с. 364].

Сёння з'яўляецца відавочным, што рэалізацыі ідэй літоўскай і беларускай дзяржаўнасцей папярэднічалі намеры і спробы працягнуць ранейшую гістарычную традыцыю – аднавіць Вялікае Княства Літоўскае, зразумела, на новай аснове і ў новых формах. Ад заснаванага на гістарычнай памяці аб тэрытарыяльнай непадзельнасці "гістарычнай Літвы" намеру аб'яднаць Беларусь і Літву ў адной дзяржаве з агульнымі межамі, сталіцай, урадам, канстытуцыяй канчаткова адмовіліся толькі ў сярэдзіне 1920-х гг.

Гісторыя змагання ў першыя дзесяцігоддзі ХХ ст. народаў былогаВКЛ, пазбаўленых уласнай дзяржаўнасці, за яго аднаўленне навукова актуалізавалася са зменай у гэтым рэгіёне геапалітычнай сітуацыі, выкліканай распадам СССР. На змену ранейшаму падыходу, які ігнараваў альтэрнатыўныя шляхі нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва, акрамя савецкага, прыйшло новае бачанне праблемы. Прыярытэтная ўвага сучаснай гістарыяграфіі да нацыянальных рухаў, распаду імперый і ўтварэння на іх руінах новых дзяржаў у першай чвэрці ХХ ст. не абмінае цікавасці да пытання аб месцы і ролі ў гэтых працэсах дзяржаўна-палітычнай традыцыі ВКЛ.

Складаемыя часткі спадчыны ВКЛ у разуменні яго правапераемнікаў наступныя: самастойная, незалежная ад суседзяў дзяржава з уласнай назвай; Статут ВКЛ; Віленскі ўніверсітэт (з музеем і архівам); Народны архіў (Літоўская Метрыка); уласныя войска, грошы, сойм; народныя традыцыі. Такі "камплект" спадчыны пералічыў, у прыватнасці, у сваім мемарыяле ад 22 лютага 1906 г. з'езд літоўцаў Амерыкі [2, арк. 1]. Да дзяржаўна-палітычнай спадчыны ВКЛ мы адносім самую знішчаную дзяржаву і яе забраныя атрыбуты: тэрыторыя, сталіца Вільня, органы ўлады (сойм), заканадаўства (Статут ВКЛ), грошы, войска, традыцыя змагання за якія склалася на працягу канца XVIII–XIX стст.

Мэта артыкула – характарыстыка досведу выкарыстання дзяржаўна-палітычнай спадчыны ВКЛ нацыянальнымі рухамі яго правапераемнікаў у пачатку ХХ ст. Прадмет даследавання – ідэалогія беларускага, літоўскага і польскага нацыянальных рухаў гэтага перыяду.

Уласцівую беларускаму грамадска-палітычнаму руху пачатку ХХ ст. тэндэнцыю змагання за адраджэнне ВКЛ разглядалі ў кантэксце сваіх праблемных палёў беларускія гісторыкі М.С. Сташкевіч [3], А.Ф. Смалянчук [4–7], С.М. Хоміч [8], З.В. Шыбека [9] і інш. Ідэалогія беларускага нацыянальнага руху з яго настальгіяй па ВКЛ знайшла адлюстраванне ў абагульняючай працы па гісторыі беларускай дзяржаўнасці [10].

У вялізнай польскай літаратуры па гісторыі барацьбы за адбудову Рэчы Паспалітай шэраг аўтараў удзяляюць значную ўвагу месцу ў гэтым працэсе беларускага і літоўскага фактараў. Польскі погляд на ідэю рэстытуцыі ВКЛ, якая ўсплыла ў канцы новага часу, рэпрэзентуюць працы сучаснікаў і першых даследчыкаў тых падзей Л. Васілеўскага [11–13], В. Вельгорскага [14; 15] і інш., а таксама гісторыкаў другой паловы XX – пачатку XXI ст. – К. Грунберга [16], С. Ланеца [17], Ю. Паеўскага [18] і інш.

Пытанне аб досведзе выкарыстання правапераемнікамі ВКЛ яго дзяржаўна-палітычнай спадчыны разглядаецца ў працах сучаснага літоўскага гісторыка Р. Мікныса [19] і амерыканскага даследчака Т. Снайдэра [1].

Нягледзячы на існуючыя навуковыя напрацоўкі па праблеме пошуку ў першай чвэрці XX ст. шляхоў дзяржаўнага самавызначэння Беларусі ў гістарычнай форме ВКЛ, параўнальнае вывучэнне досведу выкарыстання спадчыны ВКЛ яго правапераемнікамі ў працэсе дзяржаваўтварэння і спроб яе прыстасавання да сваіх нацыянальных патрэб яшчэ далёкае ад завяршэння. Артыкул прыводзіць даследаванасць праблемы ў адпаведнасць з сучасным станам ведаў, паглыбляючы разуменне эпохі нацыяўтварэння, асаблівасцяў трансфармацыі нацыянальных ідэалогій і фарміравання нацыянальных дзяржаў у беларуска-літоўскім рэгіёне.

Тэарэтыка-метадалагічную аснову артыкула складаюць сучасныя тэорыі: сацыякультурнай траўмы П. Штомпке, палітычнай нацыі, а таксама канцэпцыя нацыяўтварэння ва Усходняй Еўропе Т. Снайдэра, разгледжаная ім праз феномен спадчыны Рэчы Паспалітай і ВКЛ.

Калі разглядаць знішчэнне ВКЛ у канцы XVIII ст. як сацыякультурную траўму [20; 21], тэорыя польскага сацыёлага П. Штомпке дапамагае зразумець прычыны звароту да ідэі яго рэстытуцыі ў тым пакаленні палітыкаў і мысліцеляў, якія ў ВКЛ ужо не нарадзіліся і паўстанні за яго не ўздымалі. Працы А. Смалянчука [4–7] важныя для разумення сутнасці краёвай ідэі, яе беларускай "версіі" і фарміравання на яе аснове канцэпцыі адбудовы ВКЛ, а таксама для прымянення тэорыі палітычнай нацыі адносна краёўцаў, грамадзян Беларуска-літоўскага Краю. Канцэпцыя Т. Снайдэра [1] тлумачыць месца дзяржаўна-палітычнай традыцыі ВКЛ у фарміраванні і двухсотгадовай гісторыі (канец XVIII – канец XX ст.) польскай, літоўскай і беларускай нацый; прасочвае фарміраванне і праводзіць параўнанне іх нацыянальных ідэнтычнасцей; паказвае змену інтэрпрэтацыі паняцця "Літва" ад шматнацыянальнай дзяржавы да "вотчыны" аднаго этнасу.

Артыкул падрыхтаваны на аснове дакументальных і апавядальных, апублікаваных і архіўных крыніц. Дакументальныя крыніцы прадстаўлены матэрыяламі справаводства (пратаколы канферэнцый, сходаў, нарад, з'ездаў, стэнаграмы дакладаў, справаздачы, рэзалюцыі, мемарандумы, афіцыйная перапіска і інш.).

Вялікі інфармацыйны патэнцыял мае палітычная публіцыстыка даследуемай эпохі: праграмы партый, лістоўкі, праекты геапалітычнага ўладкавання беларуска-літоўскага рэгіёна, запіскі, адозвы, універсалы, заявы, рэфераты, а таксама творы лідараў і ідэолагаў нацыянальных рухаў краю: А. Луцкевіча [22–24], Р. Дмоўскага [25] і інш. Апеляцыя дзяржаватворчых сіл краю да гісторыі адбілася на старонках тагачаснай перыёдыкі.

Выкарыстанне палітычнай традыцыі ВКЛ у пошуках яго спадчыннікаміі шляхоў дзяржаўнага будаўніцтва дапамагаюць раскрыць работы навукова-папулярнага характару, якія выйшлі з-пад пяра ўдзельнікаў нацыянальных рухаў і дзяржаўнага будаўніцтва Беларусі, Літвы, Польшчы (Л. Кульчыцкага [26], Т. Грыба [27] і інш.), а таксама прадстаўнікоў іх эміграцыі (Й. Бельскіса [28], Й. Ліхтэнштула [29], С. Саніцкага [30] і інш.). Інфармацыя аб звароце беларускага руху да палітычнай спадчыны ВКЛ утрымліваецца ў прызначанай для службовага карыстання хронікі "Кароткі нарыс беларускага пытаньня", падрыхтаванай у 1928 г. польскімі спецслужбамі на аснове назапашаных у іх аналітычных матэрыялаў [31].

Крыніцы даследуемай эпохі дастаткова добра захаваныя, хоць і раскіданыя па архівах розных краін. Яны выяўлены аўтарам у Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва ў Мінску (фонд 3 "Калекцыя дакументаў аддзела рукапісаў Беларускага музея імя Івана Луцкевіча ў г. Вільня") [27], Бібліятэцы Акадэміі навук Літвы ў Вільнюсе (фонд 21 "Беларускі фонд" з дакументамі віленскіх беларускіх палітычных структур) [32], Дзяржаўным архіве Расійскай Федэрацыі (фонд 102 "Дэпартамент паліцыі. Агляды" [33; 34], фонд 579 "Мілюкоў П.Н." [2; 35], фонд 586 "Плеве В.К." [36]).

На падставе азначаных крыніц, можна ўстанавіць ход палітычнага мыслення, ідэі, праекты, жаданні партый, арганізацый і іх правадыроў, хоць вывучаць пакінутыя на пісьме нешматлікім словам думкі і погляды цяжэй, чым дзеянні людзей.

**Асноўная частка.** ***Абставіны звароту да гістарычнай традыцыі.*** Мінулі выкліканыя падаўленнем паўстання 1863–1864 гг. часы грамадскай апатыі і ментальнай стагнацыі народаў-спадкаемцаў ВКЛ і Рэчы Паспалітай. На мяжы XIX–XX стст. на арэне барацьбы з'явіліся новыя сілы і палітычныя настроі.

Падзеі 1890-х гг. – перанос праху Адама Міцкевіча з Парыжа ў Кракаў (1890 г.), стагоддзе Канстытуцыі 3 мая, Таргавіцкай канфедэрацыі, паўстання пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі – абуджалі ўспаміны палякаў і літвінаў пра барацьбу за сваю самастойнасць у канцы XVIII ст. У 1893 г., 100-ю гадавіну Таргавіцкай канфедэрацыі, "уся краіна ад вясёлай Варшавы да аддаленых куткоў Літвы" апранулася ў жалобу. Як гаварылася ў аглядзе рэвалюцыйнага руху на гэтых землях, зробленым у 1899 г. для члена расійскага ўрада П.А. Шувалава, не пазначаныя ў календары, гэтыя дні і гадавіны былі захаваныя ў сэр-

цах палякаў і літвінаў [36, л. 4, 9 адв., 25 адв.]. Абуджаныя ўспаміны "аб славутым гістарычным мінулым Літвы" нараджалі памкненні да адраджэння яе палітычнай самастойнасці [36, л. 47 адв.].

Грамадскую думку ўзбударажыла ўстаноўка ў Вільні, агульнай святыні народаў беларускага-літоўскага краю, помнікаў М. Мураўёву (1897 г.), які 40 гадоў таму "агнём і крывёю заліў усю нашу краіну", і Кацярыне II (1903 г.), "якая 100 гадоў таму наклала на нас сваю ўладу" [34, л. 299 адв. – 300; 36, л. 41].

У згаданым аналітычным аглядзе для графа Шувалава гаварылася, што ідэя аднаўлення страчанай дзяржаўнасці не згасла сярод народаў былога ВКЛ і Рэчы Паспалітай, а знаходзіла ўсё больш прыхільнікаў па меры знікнення слядоў апошняга паўстання і ўзрастання новых пакаленняў. Аглядальнік перасцерагаў графа: гістарычны прыклад пераможаных народаў вучыць, што яны дамагаюцца самастойнасці толькі шляхам дзейснага супраціўлення, бо пасіўнасць вядзе да страты даверу да палітычнай сілы народа [36, л. 2–2 адв.].

Культурная работа інтэлектуалаў – навуковыя даследаванні, кнігі, калекцыі старажытных артэфактаў, газеты (літоўская "Aušra" з 1883 г., беларуская "Наша ніва" з 1905 г.) – будзілі ў народаў нацыянальны дух. Моладдзю, інтэлігенцыяй усё больш авалодвалі патрыятычна-рэвалюцыйныя настроі, якія ішлі і ў народныя масы. На гістарычную арэну ўпершыню выходзіў народ. У новай атмасферы пачало абуджацца палітычнае жыццё. Гэта вылівалася ў стварэнне тайных гурткоў і партый на радзіме і за мяжой. З'явіліся прыхільнікі падрыхтоўкі новага паўстання. У Варшаве і Вільні вялася "дзейсная агітацыя на глебе тэрора". Не выключалася цaразабойства [36, л. 3, 12]. У 1905 г. задавалі пытанне: "Чацвёртае паўстанне ці першая рэвалюцыя?" [18, с. 21]. Прадпрымаюцца спробы аб'яднання палітычных сіл народаў краю. Іх нацыянальныя рухі пачынаюць выпрацоўваць свае палітычныя ідэалы.

Моцная апазіцыя існуючаму дзяржаўнаму ўладкаванню, якая з 1903 г. праявілася ў рускім грамадстве, не замарудзіла аказаць уплыў на эвалюцыю поглядаў палітычных сіл на ўскраінах імперыі. Востры крызіс царскай улады пасля выбуху ў 1904 г. Руска-японскай вайны, падзенне прэстыжу манархіі, расстройства фінансаў імперыі разам з накалёнай грамадска-палітычнай атмсасферай у "турме народаў" прадвяшчалі вялікія і беспаваротныя змены. У цэнтры і на перыферыі для ўсіх стала зразумелым, што падзеі, якія разыгрываліся на Далёкім Усходзе, незалежна ад зыходу вайны, штурхнуць Расію на новы шлях, прымусяць змяніць адносіны да прыгнечаных нацый, лічыцца з імі.

Да народаў Паўночна-Заходняга краю вярталася страчаная вера ва ўласныя сілы. Вайна абудзіла іх ад "палітычнай спячкі". Новае пакаленне іх інтэлігенцыі набывала практыку палітычнага жыцця. Пачалі адкрыта гаварыць аб праве нацый на самавызначэнне. У Беларусі, Літве, Польшчы з'яўляліся радыкальныя і рэвалюцыйныя жаданні. "Адновім Айчыну «ў межах, якія Бог вызначыў і гістарычныя традыцыі перадалі»", – галоўнае з іх. [37, с. 52] З'явіліся новыя палітычныя і сацыяльныя лозунгі.

Моцны імпульс для палітычнай дзейнасці на абшарах былога ВКЛ і Рэчы Паспалітай далі канферэнцыя рэвалюцыйных і ліберальных партый Расіі ў Парыжы 30 верасня – 2 кастрычніка 1904 г. і першы з'езд дзеячаў земстваў Расіі 6–9 лістапада 1904 г. Канферэнцыя асудзіла царскую палітыку нацыянальнага прыгнёту і выказалася за права самавызначэння народаў. З'езд выступіў за пашырэнне на ўсю тэрыторыю імперыі мясцовага самакіравання, якога ў паўночна-заходніх губернях да гэтага часу не было. [11, с. 198; 19, с. 100]

Адукаванае грамадства заходніх губерняў адчула, што ўрад вагаецца і гатовы пайсці на нейкія рэформы. У Варшаве і Вільні, цэнтрах літоўскага і беларускага нацыянальных рухаў, адбываюцца шматлікія сходы інтэлігенцыі, на якіх абмяркоўваюцца патрэбы народаў краю, выпрацоўваюцца праграмы дзеянняў.

Побач з праблемамі Фінляндыі (парушэнне яе канстытуцыйных правоў) і Польшчы (пошук новых шляхоў атрымання палітычнай незалежнасці, ідэя палітычнай аўтаноміі Каралеўства Польскага), востра ўзнятымі ў 1904–1905 гг., выходзіла пытанне будучыні Беларусі і Літвы. Праўда, як слушна заважыў Р. Мікныс, зрабіць пытанне іх палітычнай аўтаноміі прадметам афіцыйных палітычных дэбатаў было вельмі цяжка, непараўнальна цяжэй, чым праблем Польшчы і Фінляндыі. Катэгарычную настроенасць супраць пастаноўкі пытання аб самастойнай Беларусі-Літве мелі кіруючыя колы Расіі, якія прызнавалі былую тэрыторыю ВКЛ "спрадвечна рускай зямлёй". Справу ўскладнялі галасы польскіх палітычных сіл, якія таксама прэтэндавалі на спадчыну ВКЛ, сваім рытарычным пытаннем, "што такое Літва, якой павінна быць, а дакладней з кім і супраць каго?" [19, с. 100–101]. Справа ў тым, што сярод беларускай і літоўскай інтэлігенцыі традыцыйна існаваў пэўны палітычны сепаратызм адносна Кароны. Ён, аднак, не перакрочваў межаў таго, што называюць "рэгіяналізмам" у адносінах да агульнай польска-літоўскай айчыны [14, с. 143–144].

У палітычных дыскусіях, распачатых у 1904–1905 гг., аб праве народаў ВКЛ на самавызначэнне прэтэндэнты на яго спадчыну апелявалі да гістарычнай традыцыі, якую паступова ўсё больш прыстасоўвалі да інтарэсаў сваіх нацый і патрэб бягучай палітыкі. Выпрацоўваліся розныя варыянты ідэі рэінкарнацыі ВКЛ у розных палітычных камбінацыях.

Гэтай інтэлігенцкай ідэяй былі апантаны прадстаўнікі розных грамадска-палітычных і нацыянальных рухаў. Некаторыя іх лідары і ідэолагі мелі "дзяржаўнае пачуццё" і палітычную свядомасць – перакананне ў тым, што час адбудовы наступіць. Гэта было дастаткова вузкае кола людзей з ліку магнатаў, шляхты і сялян (літоўскі рух быў прадстаўлены галоўным чынам інтэлігенцыяй у першым пакаленні, з сялян), гатовых актыўна дзейнічаць, легальна і нелегальна, у імя абароны нацыянальных правоў сваіх

народаў і атрымання імі незалежнасці. Мысліцелі і палітыкі, яны разумелі, што для адраджэння ВКЛ патрэбны два фактары: знешні і ўнутраны. Знешні фактар – змена міжнароднай сітуацыі і падзенне царызму ў Расіі. Унутраны – працяг стогадовай традыцыі змагання. Эпоха войнаў і рэвалюцый, якая пачалася ў 1904–1905 гг., упершыню пасля 1795 г. стварыла перадумовы для рэалізацыі募 мараў некалькіх пакаленняў змагароў і спрычынілася да высвятлення пазіцый народаў-нашчадкаў ВКЛ.

***Традыцыя гістарычнай Літвы ў краёвай ідэалогіі.*** У пачатку XX ст. сярод беларускай і літоўскай інтэлігенцыі польскай культуры карысталася падтрымкай краёвая ідэалогія, якая будавалася на гістарычнай свядомасці і памяці, і апелявала да дзяржаўнай традыцыі ВКЛ [4, с. 106; 6, с. 67–68, 75–77].

Краёўцы трактавалі беларуска-літоўскія землі як адзіны арганізм – край, што гістарычна сфарміраваўся ў межах ВКЛ, меў свае традыцыі і да гэтага часу ўяўляў сабой тэрытарыяльнае, эканамічнае і культурнае цэлае. Падзел гэтага адзінства здаваўся краёўцам ненатуральным і шкодным. Большасць мясцовай шляхты не ўспрымала Літву і Беларусь самадастатковымі культурна-гістарычнымі, а тым больш палітычнымі адзінкамі [38, с. 230].

Да краёўцаў адносілі карэнных жыхароў краю: беларусаў, літоўцаў, палякаў, часам яўрэяў, якія лічылі сваёй радзімай гістарычную Літву, усведамлялі сябе грамадзянамі Краю, і чыя самасвядомасць укладвалася ў формулу “па паходжанні – літвін, па нацыі – паляк”. Усе яны, незалежна ад культурнай, моўнай і канфесійнай прыналежнасці, на думку краёўцаў, належалі да адной палітычнай нацыі, галоўнымі рысамі якой з’яўляліся патрыятызм і любоў да Літвы. Тэрмін “Літва” ўжываўся з пункту гледжання гісторыі і абазначаў літоўскія і беларускія землі [10, с. 227–228]. Частка шляхты і інтэлігенцыі гэтых зямель і ў пачатку XX ст. захоўвала свядомасць грамадзян ВКЛ. Краёвая ідэя несла на сабе адбітак колішняй шляхецкай “нацыі” часоў Рэчы Паспалітай абодвух народаў [7].

Будучыню Літвы краёўцы бачылі ў самастойнасці, непадзельнасці і новай уніі з Польшчай, а унію лічылі сродкам дасягнення самастойнасці і трактавалі як саюз роўных партнёраў [10, с. 232].

Краёвы рух – з’ява выключна мясцовага паходжання. Гэты феномен грамадска-палітычнага жыцця Беларусі і Літвы праявіўся менавіта ў час рэвалюцыі 1905–1907 гг. Канцэпцыя краёвасці, сфармуляваная на старонках “Кур’ера Літоўскага (восень 1905 г.)” [39, с. 2], “Газеты Віленскай” (15 лютага 1906 г.), прадугледжвала раўнапраўе польскага, літоўскага і беларускага народаў. Краёвая палітыка “згоды народаў” супрацьстаяла этнічнаму нацыяналізму і спрыяла захаванню ў краі традыцыйных добрасуседскіх адносінаў [10, с. 232, 234], але адначасова не абмяжоўвала прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей у магчымасці быць актыўнымі ўдзельнікамі сваіх этнічных рухаў [3, с. 154]. Адметнасць палітычнай дактрыны краёўцаў трымалася на жыццяздольнасці гістарычнай традыцыі, спалучанай з ідэяй талерантнасці і перакананнем у патрэбе добрасуседскага суіснавання і міжнацыянальнай згоды [5, с. 126; 6, с. 76]

Адзінства ў разуменні краёвай ідэі не было нават сярод яе ідэолагаў. Сфарміраваліся кансерватыўная (К. і Р. Скірмунты, Б. Ялавецкі і інш.) і дэмакратычная (М. Ромер і інш.) плыні. Пры ўсіх разнагалоссях краёўцы ўспрымалі беларуска-літоўскі край як суб’ект гісторыі, пастаянна апелявалі да гістарычнай памяці і працавалі над яго ператварэннем у суб’ект палітыкі [10, с. 228, 232–233].

Краёўцы мелі выразнае пачуццё адметнасці Беларусі і Літвы ад Польшчы. Краёвы рух, як яго трактуе З.В. Шыбека, быў адказам беларускай і літоўскай інтэлігенцыі польскай культуры на рускі шавінізм з аднаго боку і польскі нацыяналізм – з другога, і абумоўліваўся захаваннем агульных польска-беларуска-літоўскіх традыцый на Віленшчыне. Так, М. Ромер прапанаваў лозунг незалежнасці ВКЛ ад Польшчы, якое функцыянавала бы па ўзоры ЗША [9, с. 158]. Паводле А. Смалянчука, у пэўным сэнсе краёвасць была ідэалагічным адказам і на праграму аўтаноміі этнічнай Літвы “з прылеглымі тэыторыямі”, зацверджаную на Вялікім віленскім сейме 1905 г. На лозунг “Літва для літоўцаў” краёўцы адказвалі лозунгам “Літва для Літвы” [5, с. 130].

Асновай краёвай згоды лічылася паразуменне і супрацоўніцтва дэмакратычных сіл усіх нацыянальных рухаў, якое пачалося яшчэ напярэдадні рэвалюцыі 1905–1907 гг. Яго яркай праявай сталі міжнацыянальныя кансультацыйныя з’езды прадстаўнікоў дэмакратычнай інтэлігенцыі літоўскіх і беларускіх зямель у Вільні ў перыяд паміж снежнем 1904 г. і чэрвенем 1905 г., дзе ўпершыню адбылася адкрытая дыскусія вакол канцэпцыі дзяржаўнасці краю. Сярод ініцыятараў гэтых сходаў быў Міхаіл Ромер, адзін з лідараў краёвага руху Беларусі і Літвы.

Усе ўдзельнікі сходаў прымалі ідэю палітычнай і адміністрацыйнай аўтаноміі краю ў межах Расійскай імперыі, але разумелі яе па-рознаму. Прадстаўнікі палякаў, беларусаў, яўрэяў, грунтуючыся на гістарычнай, культурнай і эканамічнай цэласнасці тэрыторыі, звязвалі будучыню краю з аўтаноміяй гістарычнай Літвы ў той час, як літоўцы настойвалі на аўтаноміі этнічнай Літвы “з прылеглымі тэрыторыямі”.

Дыялог паміж прыхільнікамі дзвюх канцэпцый дазволіў пагадзіцца з неабходнасцю гарантаваць раўнапраўе нацый у будучай аўтаномнай Літве.

У маі 1905 г. гэты своеасаблівы клуб аўтанамістаў перастаў існаваць, галоўным чынам, у сувязі з абвастрэннем польска-літоўскіх адносін, хоць кантакты паміж дэмакратамі нацыянальных рухаў краю не былі цалкам перарваныя [5, с. 142; 19]. Аднак, ва ўмовах узмацнення беларускага і літоўскага рухаў, краёўцы не здолелі дасягнуць адзінства, а іх палітыка народнай згоды не знайшла дастатковай падтрымкі ў шматэтнічным і шматканфесійным краі [10, с. 234].

Восенню 1905 г. адзін з ідэолагаў краёвага руху, Раман Скірмунт, агучыў ў "Літоўскім кур'еры" ідэю стварэння Краёвай партыі Літвы і Беларусі "дзеля ўзгаднення і гарманізацыі трох нацыянальных патрыятызмаў – літвіна, паляка і беларуса" і спрыяння эканамічнаму, культурнаму, нацыянальнаму развіццю гэтых народаў. Перад партыяй ставілася задача дамагацца "палітычнай канцэнтрацыі <…> Літвы і Белай Русі з Палессем як самаўпраўляемай адзінкі з агульным палітычным цэнтрам у Вільні і культурнасамакіруемымі цэнтрамі ў Коўне і Мінску"; праз сваіх дэпутатаў несці гэта пытанне ў Дзяржаўную Думу і рыхтаваць глебу ў краі да самакіравання, "якое хутка нам стане даступна". [39, с. 2, 3–4, 11]

Прыхільнікамі ідэі непадзельнасці гістарычнай Літвы, як цэласнасці са сваімі палітычнымі інтарэсамі, з'яўляліся кіраўнікі беларускага нацыянальнага руху браты Іван і Антон Луцкевічы, Вацлаў Ластоўскі. Гэту ідэю віленскае беларускае кола несла ў народ праз перыёдыку і з яе дапамогай умацоўвала пазіцыі беларускага руху, пашырала кола яго прыхільнікаў, прывучала польскую і рускую грамадскасць да думкі пра заканамернасць беларускага адраджэння.

Аналізуючы "беларускі ўхіл" краёвай ідэалогіі, А. Смалянчук задае пытанне, якое яшчэ чакае навуковага адказу: "Чым была краёвасць у беларускай гісторыі пачатку XX ст.? Прагматычным разлікам этнічных рухаў, якія адчувалі ўласную слабасць? Спробай выкарыстаць палітычны варыянт нацыянальнай мабілізацыі насельніцтва? Пострамантычнымі і трохі наіўнымі спадзяваннямі некалькіх палітыкаў, далёкіх ад рэчаіснасці Беларусі і Літвы пачатку XX ст.? Ці напаўсвядомай праявай глыбінных падставаў беларускай гісторыі і тагачаснай беларускай ментальнасці?". [7]

Прыкметную ролю ў пашырэнні краёвай ідэалогіі адыгралі масонскія ложы, якія аб'ядналі частку дэмакратычных сіл усіх нацыянальных рухаў Беларусі і Літвы [7]. У пачатку Першай сусветнай вайны масоны краю стварылі ложу «Вялікі Усход Літвы», якая адмовілася падпарадкоўвацца кіруючаму цэнтру расійскіх масонаў, і стала самастойнай. Яны разышліся ў поглядах на будучыню Беларусі і Літвы. Расійскае масонскае кіраўніцтва не прызнавала правоў беларускага і літоўскага народаў на самавызначэнне і стварэнне сваіх форм дзяржаўнага жыцця. У палітычным плане члены ложы «Вялікі Усход Літвы» адстойвалі поўную незалежнасць гістарычнай Літвы (Вялікага Княства Літоўскага) як дзяржаўнага ўтварэння беларусаў і літоўцаў [3, с. 31, 153–154; 10, с. 256–257].

***Ідэя адбудовы ВКЛ у беларускім нацыянальным руху.*** З пачатку XX ст. моцныя акцэнты нацыявызвалення, ўмовы, што спрыялі барацьбе за нацыянальную і палітычную тоеснасць, з'явіліся ў Беларусі, якая ў паслялюблінскі перыяд ахоплівала 80 % тэрыторыі гістарычнай Літвы (ВКЛ). Праўда, даследчыкі адзначаюць, што ў канцы XIX ст. украінцы, літоўцы, латышы апярэжвалі іх на 20–30 гадоў у сваіх патрабаваннях і барацьбе за ідэнтычнасць [17, с. 9].

Аднак у бурлівых 1904–1905 гг. беларускі рух узмацніўся, пачаў пранікаць у масы, хоць развіваўся ў выключна неспрыяльных умовах і быў вельмі сціплым. А падчас Першай сусветнай вайны беларусы прайшлі шлях, які іншыя нацыі ў працэсе самаўсведамлення праходзілі за дзесяцігоддзі [40, с. 164].

Разам з іншымі народамі Усходняй Еўропы беларусы шукалі сябе ў новай палітычнай сістэме. З пачатку XX ст. актывізавалася дзейнасць інтэлігенцыі, спачатку нешматлікай, але дынамічнай у рэалізацыі важнейшай нацыянальнай мэты – барацьбы за вызваленне. За пошукі шляхоў дзяржаўнага і нацыянальнага самавызначэння Беларусі ўзяліся інтэлектуалы. Пачала фарміравацца беларуская палітычная думка, абапертая на новых задачах.

Па словах Т. Грыба, выхаваная на ідэях Я. Чачота, К. Каліноўскага і Ф. Багушэвіча беларуская рэвалюцыйная дэмакратыя восенню 1902 г. заклала "Беларускі гурток народнай асветы" (заснавальнік І. Луцкевіч), які ў 1903 г. "прымае зусім выразную палітычную праграму і ставіць сваім заданнем аб'яднанне ўсіх дэмакратычных элементаў Беларусі і Літвы на грунце адбудовы страчанай дзяржаўнасці Вялікага Княства Літоўскага" [27, арк. 57].

З першымі праявамі нацыянальнага руху, як пісаў А. Луцкевіч, у мясцовым грамадстве "будзіліся яркія ўспаміны незалежнага бытавання і расло жаданне вызвалення <…> выдзяленнем краю з агульнарасійскага арганізму, здабыццём утрачанай незалежнасці". Ужо ў 1904–1905 гг. на шматлікіх з'ездах, нарадах і мітынгах высоўваліся думкі практычнага характару адносна эканамічных і дзяржаўна-прававых асноў будучай Беларусі. У дыскусіях акрэслілася думка, што Беларусь, адрэзаная ад мора, з перарэзанымі адвечнымі гандлёвымі дарогамі да яго – рэкамі Нёманам, Дзвіной і Дняпром – не зможа незалежна развівацца эканамічна і палітычна. Таму да ранейшай формулы "вызваленне з-пад прыгнёту Расіі" дадаецца новая: "вольная Беларусь, як дэмакратычная рэспубліка, сфедэраваная з суседзямі". Гэта формула знайшла месца ў новай праграме БСГ (Беларуская сацыялістычная грамада) і прыхільнасць у беларускім грамадстве. З канца 1905 г. на гэтай платформе паўсталі новыя палітычныя парты і арганізацыі: Сацыялістычная партыя Белай Русі, Беларускі сялянскі саюз, Саюз беларускіх народых настаўнікаў, Саюз настаўніцкіх семінарый, арганізацыі рабочых, студэнцкай моладзі і інш. Гэтая ідэя праводзілася ў беларускай прэсе, здабытай пасля 1905 г. З ёю беларусы ўдзельнічалі ў саюзе і з'ездах аўтанамістаў-федэралістаў [32, л. 5–5 адв.].

Але, паводле А. Луцкевіча, "вайна, адкрыта аб'яўленая беларусам пасля 1905 г." большасцю расійскага грамадства і краёвых палякаў. "Рост нацыяналізму і агрэсіўнасці" з захаду і ўсходу адбіўся "на

аб'ёме формулы федэрацыі". На першы план выйшла думка аб збліжэнні з тымі краямі і народамі, з якімі беларусаў звязваюць больш моцныя сувязі, чым "выпадковая" прыналежнасць да адной дзяржавы, і ад якіх не трэба чакаць агрэсіўнасці. "Тут на першым плане стаялі літвіны". [32, л. 5 адв.]

З літоўцамі, па словах А. Луцкевіча, беларусы былі заўсёды звязаны вельмі блізка. У аснове гэтай блізкасці ляжыць колішняя сумесная праца над стварэннем сваёй агульнай незалежнай дзяржавы, у якой беларусы дасягнулі найвышэйшага культурнага росквіту. Беларусаў збліжалі з літоўцамі доўгае сумеснае жыццё, змаганне за незалежнасць сваёй дзяржавы, агульнае права, а да таго ж іх і цяпер злучаюць агульныя гандлёвая арганізацыя, водны шлях па Нёману да мора, умовы эканамічнага жыцця. Выхад да Балтыйскага мора, на думку А. Луцкевіча, – гэта галоўная ўмова пасяховага эканамічнага развіцця Беларусі. І пасля заняпаду ВКЛ беларусы разам з літоўцамі бараніліся ад апетытаў заходніх і ўсходніх суседзяў. І, ўрэшце, – агульная гістарычная сталіца Вільня, якая была і застаецца цэнтрам культурнага, грамадскага, эканамічнага жыцця абодвух народаў [32, л. 5 адв.].

Акрамя таго, працягваў А. Луцкевіч, эканамічныя інтарэсы Беларусі, арыентаваныя на Чорнае мора, з якім яе звязвае Днепр, а таксама "адвечныя супольныя гістарычныя традыцыі і ўспаміны, блізкасць культур і моў", працяглая агульная мяжа – ад Бранска да Польшчы – прымушалі шукаць апоры і саюза з украінцамі. [32, л. 6–6 адв.]

Так, канстатуе А. Луцкевіч, ідэя федэрацыі з суседнімі народамі, "пры больш цесным збліжэнні з Літвой", "зрабілася самай папулярнай <…> для беларускага свядомага грамадзянства", стала нібыта аддаленым нацыянальным палітычным ідэалам, на якім зышліся беларусы ўсіх партый і палітычных кірункаў. Спаўненне гэтага ідэала магло б у найбольш поўнай меры забяспечыць беларускаму народу магчымасці ўсебаковага развіцця і сапраўдную волю. Выразнік ідэі адбудовы ВКЛ і аўтар праекта Балтыйска-Чарнаморскага саюза, краёвец і сацыяліст, А. Луцкевіч разумеў: нельга ашукваць сябе надзеямі на лёгкае дасягненне гэтага палітычнага ідэалу. Нават калі выкажуць згоду суседзі, ён меў бы шансы толькі пры адной умове – поўным развале расійскай дзяржаўнай сістэмы. [32, л. 6 адв. – 7]

На думку І. Ліхтэншула, аўтара артыкула "Беларуская праблема ва Усходняй Еўропе" (1944 г.), тэндэнцыя кааперацыі і суіснавання, пошук падтрымкі з'яўляецца базавай рысай нацыянальнай псіхалогіі беларусаў, якія на працягу апошніх васьмі стагоддзяў не жылі нацыянальна асобна, але суіснавалі з іншымі народамі. Пры гэтым ён адзначыў, што "праз усю гісторыю беларусы былі нацэлены на супрацоўніцтва, заўсёды праз мірныя альянсы, а не заваёву" [29, с. 2]. Аўтар артыкула звярнуў увагу таксама на тое, што мінулае Беларусі "зацемнена чужым імем Літвы", хоць, на яго думку, яно "намнога больш старажытнае і бліскучае, чым Малой і Вялікай Расіі" [29, с. 5].

У 1924 г. адзін з артыкулаў нямецкага часопіса "Litauische Rundschau", які выдаваўся ў Коўне на нямецкія грошы, разважаў на тэму, як Літве атрымаць Вільню, бо Ліга Нацый гэтае пытанне на яе карысць вырашыць не можа. Аўтар артыкула прааналізаваў варыянты будучыні Літвы ў цалкам магчымых камбінацыях дзяржаў: Германія-Літва-Расія або Германія-Літва (такія саюзы цяпер "не па часе", несвоечасовыя) і Літва-Польшча (гэты саюз наогул "бессэнсоўны") – і высунуў "трэцюю камбінацыю": аб'яднанне Літвы з Беларуссю і Украінай, "якое і магло б даць Літве Вільню".

На такі паварот аўтарскіх разважанняў па віленскім пытанні А. Луцкевіч адказаў артыкулам пад назвай "Уваскросшы праект (аб беларуска-ўкраінска-літоўскім саюзе)" [23]. У ім ён пісаў, што яшчэ задоўга да сусветнай вайны ў беларускім, украінскім і часткі літоўскага грамадства лунала думка аб "трайным саюзе" гэтых народаў. Ідэя мела пад сабой не толькі "ідэйныя пабуджэньні" – супольнасць нацыянальных ідэалаў, "але і вельмі рэальныя падставы": патрэбу змагання з агульнымі ворагамі (Масква і Варшава) і эканамічныя інтарэсы трох краін. Ідэолагі "трайнога саюзу", паводле А. Луцкевіча, лічылі, што тыя ж самыя прычыны, якія некалі прывялі да стварэння вялізнай дзяржавы ад Балтыйскага да Чорнага мора, не перасталі існаваць і пасля развалу Вялікага Княства Літоўскага. На першым плане тут стаіць геаграфічнае становішча Беларусі, Украіны і Літвы, супольнасць водных артэрыяў (сістэма рэк і каналаў), а таксама ўзаемнае дапаўненне гэтых краін прыроднымі багаццямі.

З пачаткам сусветнай вайны, як пісаў А. Луцкевіч, калі затрашчалі сцены "ўсерасійскай турмы народаў", "у якой пад замком сядзелі і мы", а вялізны абшар на захадзе быў пакінуты расійскай арміяй і акупаваны немцамі, у беларускім, украінскім і літоўскім грамадстве абудзіліся іх незалежніцкія імкненні і зноў выплыла ідэя "трайнога саюзу". Але тагачасныя "гаспадары палажэння" берлінскія палітыкі паставіліся да гэтай ідэі варожа. Германія баялася стварэння магутнай сілы аб'яднаных народаў і пайшла на іх абасабленне. Яна прызнала незалежнасць Літвы і Украіны, паміж якімі, быццам клін, павінна была ўрэзацца "расійская" Беларусь. [23]

Такім чынам, у пачатку ХХ ст. беларуская думка мела два асноўныя варыянты бачання палітычнай будучыні сваіх зямель, і да Першай сусветнай вайны ў ёй не было адназначнай арыентаванасці на этнанацыянальную мадэль дзяржаўнасці. Першы падыход быў прадстаўлены краёвай ідэяй, якая прадугледжвала дзяржаўную незалежнасць і непадзельнасць гістарычнай Літвы (былога ВКЛ). Другі – пастулат нацыянальна-культурнай аўтаноміі Беларусі ў складзе дэмакратычнай Расіі.

Пастулат аўтаноміі быў сфармуляваны прадстаўнікамі пасляпаўстанцкага пакалення, якое змірылася з тым, што ВКЛ ужо не вярнуць. Яны першымі ў адрозненне ад пакаленняў 1831 г. і 1863 г., якія імкнуліся да ўласнай дзяржаўнасці ў межах 1771 г., прызналі сябе грамадзянамі Расійскай імперыі і выступілі за расійскую дзяржаўнасць і аўтаномію ў ёй. Гэты факт прыналежнасці гістарычнай Літвы да Расіі ўпершыню ў гісторыі быў шырока прызнаны беларускай і літоўскай грамадскай думкай як аснова ўласнай палітычнай ідэалогіі. Тэорыя адбудовы Літвы ў гістарычных межах пераўтварылася ў праект аўтаноміі – "ўтопію" змяніў палітычны рэалізм. Не выпадкова існуе меркаванне, што пастулат аўтаноміі належыць разглядаць як паражэнне ў змаганні за адбудову сваёй дзяржавы і кампраміс з пераможцам.

***Літоўскія канцэпцыі гістарычнай і этнаграфічнай Літвы.*** Пасля 1795 г. літоўскіх патрыётаў ВКЛ ніколі не пакідала надзея рэстаўраваць сваю дзяржаву і яе незалежнасць, і яны выкарыстоўвалі дзеля гэтага любую магчымасць.

У літоўскім грамадка-палітычным руху пачатку XX ст. у поглядзе на будучыню сваіх зямель сфаміраваліся дзве плыні: незалежнікі і аўтанамісты. Пры гэтым нацыянальная палітычная думка сфармулявала дзве канцэпцыі будучай дзяржавы: Літвы гістарычнай і Літвы этнаграфічнай. Згодна першай канцэпцыі, літоўцы згаджаліся з беларусамі жыць у адной дзяржаве, аднак прэтэндавалі на манапольнае распараджэнне спадчынай ВКЛ. Прыхільнікі другой канцэпцыі атаясамлівалі сучасную ім Літву з Літвой гістарычнай і ў адрозненне ад беларускага руху, які захоўваў традыцыі шматнацыянальнага ВКЛ, змагаліся за стварэнне на аснове ВКЛ сваёй мононацыянальнай дзяржавы.

Літоўскія палітыкі пачатку XX ст. лічылі Літву адзінай правапераемніцай ВКЛ, хоць у свой час яе тэрыторыя складала невялікую частку гэтай вялізнай дзяржавы, і адмаўлялі беларусам у праве на палітычную спадчыну ВКЛ, г. зн. у праве апеляваць да гістарычнага мінулага і гістарычнай дзяржаўна-палітычнай традыцыі. Такі падыход канчаткова аформіўся і замацаваўся ва ўмовах Першай сусветнай вайны. Згодна з ім атрымлівалася, што Літва аднаўляла сваю нацыянальную дзяржаву, страчаную са знікненнем ВКЛ. Беларусам жа даводзілася ствараць уласную дзяржаўнасць з самага пачатку, што было непараўнальна больш складана, паколькі ў вачах вядучых еўрапейскіх краін пазбаўляла беларускую нацыю гістарычнага фундаменту [10, с. 309]. Больш таго, літоўскія палітыкі, спасылаючыся на гістарычнае права, уключалі ў склад Літоўскай дзяржавы землі, якія на той час знаходзіліся ў Віленскай, Ковенскай, Гродзенскай, Сувалкаўскай, Курляндскай губернях, а таксама ў Навагрудскім павеце Мінскай губерні і паўночнай частцы Ломжынскай губерні [33, л. 221 адв.; 10, с. 310].

Рух адраджэння праводзіла літоўская інтэлігенцыя ў першым пакаленні [15, с. 52], якая паходзіла з сялян, і таму непрыхільна ставілася да шляхты і польскага нацыянальнага руху, прадстаўленага, галоўным чынам, шляхтай. Р. Мікныс канстатуе, што па меры таго, як узмацняліся праявы польскага і расійскага шавінізму, расла і нацыяналістычныя плынь у літоўскім нацыянальным руху. Калі ў 1896 г. літоўскія сацыял-дэмакраты выступілі за федэрацыю Літвы з Польшчай [15, с. 61], то ў пачатку XX ст. літоўская інтэлігенцыя ўсведамляла, што палітычная будучыня дзяржаў павінна быць асобнай. Нарастаючая польска-літоўская канфрантацыя з'ўлялася істотнай перашкодай у дамаганнях палітычнай аўтаноміі Літвы [19, с. 102].

Свае палітычныя пастулаты літоўцы адстойвалі, стварыўшы ўласныя партыі, праз агульнарасійскія партыі; ва ўрадзе Расіі; а таксама з дапамогай эміграцыі, арганізаванай і свядомай, якой беларусы не мелі.

Сфера дзейнасці Літоўскай дэмакратычнай партыі, створанай у 1902 г., распаўсюджвалася таксама і на "ўсю Рускую Літву" (Беларусь). Палітычным ідэалам партыі з'ўляліся свабода і самастойнасць Літвы, літоўская дэмакратычная рэспубліка, злучаная з суседнімі землямі на федэратыўных пачатках. ЛДП (літоўская дэмакратычная партыя) патрабавала аўтаномію для этнаграфічнай Літвы з сеймам у Вільні. Да аўтаномнага этнаграфічнага ядра Літвы, як дэкларавалася ў праграме партыі, "могуць далучыцца і суседнія іншародныя часткі па ўзаемнай згодзе, на аснове плебісцыту, правы меншасці гарантуюцца агульнадзяржаўнымі законамі. Іншапляменнай меншасці дзеля яе культурных патрэб прадстаўляецца спецыяльны бюджэт, прапарцыйна колькасці дадзенай меншасці". Афіцыйнай мовай у аўтаномнай Літве з'ўляецца літоўская, дапускаюцца і мясцовыя мовы. Кампетэнцыі цэнтральнага ўраду імперыі пакідаліся міжнародныя зносіны, мытнае ведамства, манетная справа, абарона дзяржавы. [33, л. 202 адв. – 204]

Літоўскамоўная брашура "Хто такія сацыялісты і чаго яны жадаюць" патрабавала прадаставіць Літве права самой клапаціцца пра свае справы, выпрацоўваць законы. Ведучы свае справы самастойна, яна злучыцца з суседнімі народамі (латышамі, палякамі, беларусамі, маларусамі, рускімі) на ўмовах, якія выпрацуе сейм у Вільні. [33, л. 58 адв.]

З пачаткам рэвалюцыі ў Расіі літоўскі грамадска-палітычны і нацыянальны рух актывізаваўся. Лістоўка Літоўскай сацыял-дэмакратычнай партыі "За Віленскі сейм!" (1 сакавіка 1905 г.) абвяшчала: "…нам не патрэбен толькі адзін сейм усіх нацый у Расіі. Нам патрэбна, каб Літва мела асобны сейм" [33, л. 43 адв.]. "Не пакладзём зброі, пакуль не будзе магчымасці літоўскім дэпутатам сабрацца не ў Пецярбургу, а ў Вільні, і тут рашыць, якая ўлада будзе ў Літве, ці павінна Літва па старому заставацца пад уладай Расіі або ад яе аддзяліцца", – заклікала лістоўка ЛСДП "Мужчыны да зброі" (6 лістапада 1905 г.) [33, л. 40 адв.].

У канцы 1904 г. на палітычную арэну выйшла група аўтанамістаў (аўтанамістаў-федэралістаў) – прадстаўнікоў дэмакратычных колаў Літвы і Беларусі, якія ў снежні 1904 г. – чэрвені 1905 г. арганізавалі

ў Вільні міжнацыянальныя кансультацыйныя з'езды і на іх абмяркоўвалі праблемы палітычнай і адміністрацыйнай аўтаноміі Літвы ў межах Расійскай імперыі. На гэтых з'ездах палякі, беларусы, яўрэі выступілі за гістарычную і геаграфічную аўтаномію Літвы, а літоўцы – за этнаграфічную. Першыя ў сваіх праектах апелявалі да прынцыпа грамадзянства, другія – да прынцыпа нацыянальнасці [19, с. 108].

Пазіцыя літоўцаў, як сцвярджае Р. Мікныс, стала падставай усіх далейшых непаразуменняў, хоць спачатку іх адстойванне этнаграфічнай Літвы не перакрэслівала магчымасці рэалізацыі канцэпцыі гістарычнай Літвы, тым больш, што этнаграфічная Літва павінна была ахапіць частку Гродзенскай губерні і Навагрудскі павет Мінскай губерні, а мяжа з Беларуссю праводзілася ўздоўж Вілейскага і Дзісненскага паветаў, з Польшай – па Сувалкаўскай губерні на нацыянальнай аснове. Але на нарадах літоўскай інтэлігенцыі, арганізаваных ЛДП у канцы сакавіка – пачатку красавіка 1905 г., пытанне аб палітычнай аўтаноміі Літвы ў этнаграфічных межах было пастаўлена па-новаму – гаварылася аб федэрацыйнай сувязі Літвы з усімі народамі імперыі. Беларусы трактаваліся як адзін з такіх народаў, гэта значыць, іх выразна адмежавалі ад Літвы [19, с. 108–110].

Абгрунтоўваючы аддзяленне этнаграфічнай Літвы ад Беларусі, літоўцы заявілі, што не маюць нічога супраць аўтаноміі Беларусі. Але паколькі беларускі нацыянальны рух яшчэ не выказаў імкнення да аўтаноміі Беларусі, то праграма яе аўтаноміі – гэта ідэалізм і фантазія. А горстка беларускай інтэлігенцыі не прэзентуе беларускага народа, паколькі ён яшчэ "не прачнуўся". Беларусы, на думку літоўскіх дэмакратаў, яшчэ не прайшлі працэс фарміравання на сваёй этнічнай тэрыторыі. У адрозненне ад беларусаў, у літоўцаў дасягненне палітычнай аўтаноміі павінна ўвянчаць канечны этап адраджэння літоўскага народа і працэс фарміравання літоўскай нацыі. Гэтаму найбольш адпавядала канцэпцыя Літвы этнаграфічнай. [19, с. 111]

Р. Мікныс выказвае агульную думку літоўскіх і беларускіх даследчыкаў, што калі б літоўцы выбралі канцэпцыю дзяржаўнасці Літвы гістарычнай, тым самым згадзіліся б на ролю нацыянальнай меншасці. Мела падставы і іх перасцярога, ці зможа яшчэ не ўмацаваная літоўская культура абараніць сваю індывідуальнасць перад уплывам польскай культуры, якая мела ў краі даўнія традыцыі і патэнцыял для развіцця. Небеспадстаўна ў канцэпцыі дзяржаўнасці гістарычнай Літвы літоўцы бачылі пагрозу для свайго нацыянальнага існавання. Таму падчас абмеркаванняў яны апелявалі да права народаў на самавызначэнне і, кіруючыся нацыянальным інтарэсам, стаялі на пастулаце нацыянальнай дзяржавы, якая таксама дазваляе прывязаць да традыцыі даўняй дзяржаўнасці. [19, с. 111]

З пункту погляду літоўскага даследчыка, на тых з'ездах нешматлікія прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі, абапіраючыся на канцэпцыю гістарычнай Літвы, жадалі супольнай аўтаноміі Літвы і Беларусі ў надзеі на адрыў ад расійскага культурнага ўплыву і абуджэнне, з дапамогай Літвы, нацыянальнай свядомасці ў шырэйшых колах беларускага народа. Мясцовыя палякі і яўрэі таксама бачылі лепшыя для сябе перспектывы ў палітычнай аўтаноміі Літвы ў гістарычных межах. [19, с. 111]

Дасягнуць паразумення прадстаўнікам народаў тады не ўдалося, але першыя афіцыйныя кантакты распачалі дыялог паміж прыхільнікамі дзвюх канцэпцый Літвы.

Пад канец 1905 г. літоўскі рух выступіў ужо як значная сіла ў палітычнай сферы [12, с. 81]. Важным фактам тагачаснага палітычнага жыцця стаў з'езд прадстаўнікоў літоўскага народа 21–22 лістапада 1905 г. у Вільні, які сабраў больш за 2000 удзельнікаў, што прадстаўлялі ўсе партыі Літвы, і атрымаў назву "Вялікага віленскага сейма", "нацыянальнага кангрэса". З'езд выступіў за аўтаномію Літвы з урадам у Вільні і федэрацыяй з суседнімі народамі [15, с. 61]. "Патрабавалі аўтаноміі, – піша І. Бельскіс, – на большае ад аўтакратычнай Расіі не разлічвалі" [28, с. 40]. Меркавалася, што ядром аўтаноміі стане этнаграфічная Літва, але будуць далучаны прылеглыя тэрыторыі, што да яе цягацеюць з пункту погляду эканамічнага, культурнага, нацыянальнага, або іх насельніцтва вырашыць гэта на аснове плебісцыту. Пасля з'езда інтэлігенцыя раз'язджала па гарадах і мястэчках, заклікаючы ўстанавіць самастойную літоўскую аўтаномію з сеймам у Вільні [33, л. 206–207].

Прадстаўнікі ЛСДП у Дзяржаўнай думе патрабавалі для свайго краю палітычнай аўтаноміі з мясцовым сеймам, пры якой "усе літоўскія народнасці і мовы маюць роўныя правы" [33, л. 129].

15 снежня 1905 г. група літоўскіх дзеячаў звярнулася ў Бюро канстытуцыйна-дэмакратычнай партыі з заявай аб сваёй згодзе далучыцца да партыі пры ўмове, што яна вызначыцца адносна пытання аўтаноміі Літвы і зафіксуе гэта ў сваёй праграме [35, л. 1–1 адв.].

З'езд літоўцаў, якія пражывалі ў Амерыцы, у сваім мемарыяле ад 22 лютага 1906 г. аб прадастаўленні аўтаноміі Літве выказаў гатоўнасць адрадзіць сваю знішчаную дзяржаву і рашучасць вярнуць яе забраныя атрыбуты і скарбы: "Літоўцы яшчэ не запамяталі сваіх народных традыцый і часы незалежнасці, калі яны мелі сваё войска і грошы, свой сейм, Універсітэт і свае вучылішчы". Літоўскаму народу павінны быць вернуты канфіскаваныя маёмасці манастыроў і памесцяў, лясы, Універсітэт з музеем і архівам [2, л. 1, 4]. Першая сусветная вайна наблізіла ажыццяўленне літоўскай мары.

Такім чынам, канцэпцыі дзяржаўнасці Літвы, якія сфарміраваліся ў літоўскім руху, апелявалі да ВКЛ-аўскай традыцыі, хоць і вызначалі адменную тэрыторыю, этнічны склад насельніцтва, палітыку. Канцэпцыя гістарычнай Літвы стаяла за працяг дзяржаўнай традыцыі шматэтнічнага ВКЛ. Другая – этна-

графічнай Літвы – мела мэтай стварэнне мананацыянальнай дзяржавы на аснове ВКЛ. З пачатку XX ст. літоўская палітычная думка ўсё больш эвалюцыяніравала ад свядомасці грамадзян ВКЛ да свядомасці літоўскай нацыянальнай дзяржавы [19, с. 99].

Цікава, адзначае Р. Мікныс, што дыскусіі паміж прыхільнікамі канцэпцый працягваліся нават тады, калі другая з іх была ўжо рэалізавана ў выглядзе Літоўскай Рэспублікі. Дыскусію, на яго думку, жывіла разуменне таго, што канчатковая рэалізацыя гэтай канцэпцыі адбудзецца не хутка, – трэба было вырашыць шэраг складаных праблем і пераадолець шмат перашкод. Сярод іх – пытанні аб Вільні, Клайпедзе, вяртанні культурнай спадчыны ВКЛ і інш.

Літоўская Рэспубліка, хоць і лічыла сябе прадаўжальніцай даўняй дзяржаўнасці ВКЛ, не магла ў поўнай меры выступаць у гэтай ролі, у той час, як першая канцэпцыя, якая апелявала да непасрэднай сувязі з традыцыяй гістарычнай Літвы, мела спосабы рашэння гэтых праблем. Таму яна захоўвала актуальнасць, асабліва ва ўмовах Першай сусветнай вайны [19, с. 98–99].

***Дзяржаўна-палітычная традыцыя ВКЛ у польскім руху.*** На працягу XIX ст. палякі зрабілі шмат спроб атрымаць незалежнасць. Адраджэнне Польшчы мыслілася імі разам з рэстытуцыяй межаў 1771 г. Кожны раз усе палітычныя кірункі бачылі гістарычную Польшчу – супольнасць народаў Рэчы Паспалітай. Пра Польшчу этнаграфічную тады не думалі [18, с. 15]. Таму кожны раз пры пастаноўцы пытання аб рэстаўрацыі Рэчы Паспалітай паўставала пытанне аб будучыні Літвы, Беларусі, Украіны – зямель і народаў былога Вялікага Княства Літоўскага. Іх будучыня звычайна трактавалася ў аспекце рэанімацыі міждзяржаўнай уніі, якую палякі лічылі галоўнай рысай сваёй гісторыі. Зацікаўленасць справамі Літвы і Беларусі выплывала з непасрэднага суседства і традыцыі даўняй дзяржаўнай сувязі, у якой дамінуючую ролю адыгрывала Польшча.

На мяжы XIX–XX стст. на арэну барацьбы ў польскім грамадска-палітычным руху выйшлі новыя сілы. Важную ролю ў аб’яднанні польскіх рэвалюцыйных сіл у краінах-“заборцах” (Расіі, Прусіі і Аўстрыі) адыграў з’езд груп сацыялістычнай арыентацыі, які адбыўся ў лістападзе 1892 г. у Парыжы. Заснаваная на з’ездзе ППС (Польская сацыялістыная партыя) адразу праявіла цікавасць да пытання “палітычнага вызвалення Літвы і Русі” і аб’яднання з іх палітычнымі сіламі ў барацьбе за свае ідэалы. З’езд прыняў дакумент “Kwestija Litwy i Rusi” (“Пытанне Літвы і Русі”). У яго праекце гаварылася: “Адносна літвінаў і русінаў стаім <…> на пазіцыі вольнай федэрацыі”. Канчаткова прынятая партыйная фармулíроўка дэкларавала “поўную роўнасць народаў, якія ўваходзяць у склад Рэчы Папалітай на аснове дабраахвотнай федэрацыі”. [13, с. 33, 40, 47]

Так, упершыню ў польскай палітычнай думцы была сфармулявана федэралісцкая ідэя адбудовы Рэчы Паспалітай у гістарычных межах, якая прадугледжвала стварэнне на гэтай тэрыторыі дэмакратычнай шматнацыянальнай дзяржавы на федэрацыйнай аснове. На думку Т. Снайдэра, ідэя федэралізму аформілася ў пачатку XX ст. на аснове палітычных поглядаў краёўцаў [1, с. 65–66]. У польскім руху тады атрымала пашырэнне думка аб тым, што палякі разам з літоўцамі, беларусамі і ўкраінцамі павінны ўтварыць “братнюю Рэч Паспалітую”, “саюз вольных народаў” [18, с. 29].

Найбольш яркім прадстаўніком федэралісцкай ідэі быў нашчадак літвінскай шляхецкай фаміліі, польскі рэвалюцыянер, палітык і дзяржаўны дзеяч Ю. Пілсудскі. Сваю праграму лідар ППС сфармуляваў у ліпені 1904 г. у Токіа, у мемарыяле для японскага ўраду [41, с. 29–30]. Ю. Пілсудскі засведчыў, што сярод паняволеных Расіяй народаў падставы для стварэння ўласных дзяржаў маюць толькі “народы гістарычныя”, да якіх залічыў палякаў. Перспектывы будучыні літоўцаў, беларусаў, латышоў і часткова ўкраінцаў ён бачыў у суіснаванні з адроджанай Польшчай. [19, с. 101]

Рэвалюцыянер стварыў сваю канцэпцыю будучыні Рэчы Паспалітай у выглядзе федэрацыйнага саюза вольных і раўнапраўных народаў Усходняй Еўропы [41, с. 29]. Ураджэнец Літвы, у ментальнасці якога зліваўся ў адзінае патрыятызм Рэчпаспалітаўскі і ВКЛаўскі, Ю. Пілсудскі добра ведаў гістарычную традыцыю. Даследчыкі мяркуюць, што да федэрацыйнай ідэі яго схілілі ліцвінская традыцыя, палітычны рэалізм і добрае веданне Расіі [41, с. 31].

Федэралісцкая праграма Пілсудскага, як трактуе яе польскі даследчык З. Краеўскі, адносілася найперш да літоўскіх і беларускіх зямель і меркавалася як першы этап дасягнення палітычнай стабільнасці ва Усходняй Еўропе. Ён надаваў вялікае значэнне супольнай польска-літоўскай (ВКЛаўскай) гістарычнай традыцыі. ВКЛ у яго канцэпцыі было ключом для ажыццяўлення федэрацыйных намераў. [41, с. 30]

Лідар ППС быў перакананы, што форму будучага дзяржаўнага ладу адноўленага ВКЛ абяруць яго жыхары. На літоўска-беларускіх землях цяжка было правесці нацыянальны падзел – федэрацыя магла вырашыць гэту праблему. Важная роля адводзілася Вільні і Віленшчыне, роднай зямлі. На іх прэтэндавалі літоўцы, беларусы, палякі. Федэрацыя вырашала і гэту праблему. Віленшчына станавіліся сувязным звяном, а не прадметам спрэчак [41, с. 31].

Але літоўскі і беларускі нацыянальныя рухі, якія ў той час хутка развіваліся, ужо мыслілі сваю дзяржаўную будучыню без унійнай сувязі з Польшай. Нежаданне літоўцаў да ўніі з Польшчай усё больш узмацнялася. Ідэя федэрацыі з ёй не мела шырокай грамадскай падтрымкі і ў Беларусі.

Мясцовыя палякі падзяліліся ў бачанні будучыні “гістарычнай тэрыторыі Літвы” (былога ВКЛ). У адрозненне ад большасці літвінаў, якія лічылі, што падзелы Рэчы Паспалітай паставілі кропку на польска-літоўскай уніі, краёўцы, якія захоўвалі свядомасць грамадзян ВКЛ, з’яўляліся прыхільнікамі федэрацыі. Яны былі перакананы, што унію народаў нельга разарваць [16, с. 251]. У Беларусі і Літве федэрацыйную праграму падтрымлівалі сацыялісты і буйныя землеўласнікі. Польская дэмакратычная інтэлігенцыя Вільні ў пачатку XX ст. усведамляла, што палітычная будучыня гістарычнай Літвы павінна быць асобнай ад палітычнай эвалюцыі этнічнай Польшчы, і была варожа настроена да нацыяналістычных тэндэнцый, як польскіх, так і літоўскіх [19, с. 104]. Але сярод палякаў Вільні было нямала такіх, што хацелі простага ўключэння краю ў склад Польшчы [40, с. 32].

Спачатку Ю. Пілсудскі спадзяваўся, што яму ўдасца схіліць да сваіх планаў літоўцаў і беларусаў, але хутка зразумеў, што ніхто не збіраецца падтрымліваць федэрацыю. Палякі прапанавалі стварыць яе са зброяй у руках, але гэта супярэчыла прынцыпам федэрацыі. У час гвалтоўнага выбуху нацыяналізмаў у Еўропе ідэя Пілсудскага не магла быць рэлізавана [41, с. 34].

Польская сацыялістычная партыя – адзіная польская партыя, якая выступала за федэрацыю з Літвой-Беларуссю і адбудову на іх землях ВКЛ. На канферэнцыі сацыялістычных рэвалюцыйных партый Расіі, якая праходзіла ў пачатку 1905 г. у Фінляндыі, у супольнай дэкларацыі ППС і БСГ абвяшчалася неабходнасць “выдзялення тэрыторыі гістарычнай Літвы (Літвы і Беларусі) разам з усімі нацыянальнасцямі, што яе насяляюць, у асобны палітычны арганізм” [31, с. 40].

Але пазіцыя польскіх палітычных сіл ў справе будучыні гістарычнай Літвы не была аднолькавай. Раздавалаіся галасы, што Літва і Беларусь з’яўляюцца “натуральным дапаўненнем Польшчы” і іх інкарпарацыя павінна стаць кампенсацыяй за заходнія польскія землі (прускага і аўстрыйскага “забору”). Ідэолагі эндэкаў (народных дэмакратаў) Р. Дмоўскі, Й. Паплаўскі і інш., у адрозненне ад ППС, катэгарычна выступілі супраць федэрацыйных дзяржаўных сувязяў паміж Польшчай і Літвой-Беларуссю, і бачылі гэты край як частку будучай нацыянальнай польскай дзяржавы [19, с. 101]. Польскія і літоўскія нацыяналісты, як сцвярджае Т. Снайдэр, пахавалі ідэю Пілсудскага пра адраджэнне ВКЛ [1, с. 95, 99].

Такім чынам, у польскай палітычнай думцы пачатку XX ст. існавалі дзве праграмы аднаўлення Рэчы Паспалітай: федэралісцкая і нацыянал-дэмакратычная. Першая прадугледжвала аб’яднанне Кароны з адбудаваным ВКЛ у межах свабоднай федэрацыі пры культурным лідарстве Польшчы. Другая стаяла за адраджэнне Польшчы як нацыянальнай дзяржавы палякаў і інкарапарацыю ў яе склад гістарычнай Літвы. Польскія планы тэрытарыяльнай інтэграцыі ўсходніх крэсаў у іх абодвух варыянтах не ўлічвалі нарастаючыя нацыянальныя рухі беларусаў і літоўцаў і іх незалежніцкія памкненні.

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі ў Расіі адбыўся “рэнесанс федэралістычных канцэпцый” польскіх дэмакратычных сіл. У маі 1917 г. у сумеснай “Польскай дэкларацыі ў справе Літвы” яны заявілі, што “ад імя грамадства адроджанай польскай дзяржавы жадаюць незалежнага дзяржаўнага існавання зямель былога Вялікага Княства Літоўскага” і “ўзнаўлення традыцыйнай сувязі” з ім [16, с. 258, 259].

**Заключэнне.** У пятым-шостым пакаленнях спадкаёмцаў ВКЛ (лічыцца, што новыя пакаленні ўступаюць у жыццё праз 20–25 гадоў) з новай сілай абуджаецца гістарычная памяць і абвастраецца настальгія па сваёй дзяржаве, страчанай больш за стагоддзе таму. А новая гістарычная сітуацыя – крызіс “турмы народаў” (Руска-японская вайна, Першая руская рэвалюцыя), лозунг права народаў на самавызначэнне, што набываў папулярнасць у Еўропе, – стварыла ўмовы для пастаноўкі і эвентуальнага вырашэння пытання аб адраджэнні страчанай дзяржавы.

Дзяржаўна-палітычная традыцыя ВКЛ была актуалізавана ў пачатку XX ст. краёўцамі і масонамі беларуска-літоўскіх зямель, а таксама шэрагам створаных на мяжы XIX–XX стст. палітычных партый сацыял-дэмакратычнай арыентацыі (ППС, БСГ, СДПЛ), якія ўнеслі ў свае праграмы пастулат адраджэння ВКЛ.

Палітычная спадчына ВКЛ (дзяржава, яе тэрыторыя, сталіца, органы ўлады, заканадаўства і інш.) заняла важнае месца ў ідэалогіі нацыянальных рухаў народаў, якія лічылі сябе яе правапераемнікамі: беларускага, літоўскага, польскага – і выкарыстоўвалі яе ў сваіх нацыянальных інтарэсах. Цікавасць беларускіх і літоўскіх палітыкаў да ідэі рэінкарнацыі ВКЛ абумоўлена аб’ектыўнымі прычынамі: гістарычны, геаграфічны і эканамічны фактары, агульная сталіца, слабасць уласных сіл для дзяржавастваральнай працы, імкненне да трывалага саюза з суседзямі і інш.

Аднак разыходжанне інтарэсаў нашчадкаў ВКЛ па меры фарміравання нацый і нацыянальнага самаўсведамлення, рознае бачанне будучыні народамі гістарычнай Літвы прывяло да канкурэнцыі з-за супольнай палітычнай спадчыны: прэтэнзіі на тэрыторыю ВКЛ, пазней – спрэчкі за Вільню. Адышла ў нябыт сумесная барацьба народаў за адраджэнне Рэчы Паспалітай. Тым не менш, нацыі краю прадпрымалі спробы дыялогу. Яго найбольш яркай праявай былі з’езды прадстаўнікоў дэмакратычнай інтэлігенцыі літоўска-беларускага краю ў Вільні ў канцы 1904 – першай палове 1905 гг.

У ідэалогіі кожнага з нацыянальных рухаў сфарміраваліся розныя падыходы да выкарыстання палітычнай спадчыны ВКЛ. Канцэпцыя гістарычнай Літвы ў літоўскай палітычнай думцы стаяла за працяг дзяржаўнай традыцыі шматэтнічнага ВКЛ, у той час, як канцэпцыя этнаграфічнай Літвы трактавала

яго як “вотчыну” літоўскага этнасу. Польская федэралісцкая праграма прадугледжвала адбудову ВКЛ і яго аб'яднанне праз новую унію з Каронай на ўмовах федэрацыі; а праграма нацыянал-дэмакратаў – інкарапарацыю гістарычнай Літвы ў склад Польшчы. Асабліва трывала ідэя вяртання ВКЛ на карту Еўропы прапісалася ў беларускай палітычнай думцы.

Пастулат аўтаноміі Беларусі і Літвы на аснове расійскай дзяржаўнасці, які ў пачатку ХХ ст. замацаваўся ў палітычнай ідэалогіі нацыянальных рухаў краю, можна разглядаць як прызнанне імі свайго паражэння ў змаганні за адбудову ўласнай дзяржаўнасці і кампраміс з пераможцам.

ЛІТАРАТУРА


1. Снайдэр, Т. Рэканструкцыя нацый: Польшча, Украіна, Літва, Беларусь, 1569–1999 гг. / Т. Снайдэр ; пер. з англ. ; навук. рэд. Г. Сагановіч. – Мінск : Медысонт, 2010. – 424 с.
2. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. – Ф. 579 Мілюкоў П.Н. – Воп. 1. – Спр. 1843.
3. Проблемы формирования белорусской государственности в XX – начале XXI века: избранные труды Н. С. Сташкевича / под науч. ред. А. Н. Данилова, В. С. Кошелева. – Минск : РИВШ, 2012. – 242 с.
4. Смалянчук, А. Беларускі нацыянальны рух і краёвая ідэя / А. Смалянчук // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – Białystok, 2000. – № 14. – С. 105–114.
5. Смалянчук, А. Ф. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864 – люты 1917 г. / А. Ф. Смалянчук. – СПб.: Неўскі прасцяг, 2004. – 406 с.
6. Смалянчук, А. Краёвасць стасоўна беларускага і літоўскага нацыянальных рухаў на пачатку ХХ ст. / А. Смалянчук // Беларусь і беларусы сярод суседзяў: гістарычныя стэрэатыпы і палітычныя канструкты : матэрыялы міжнар. канф. – Варшава : Oficyna Wydawnicza Uczelni Łazarskiego, 2013. – С. 66–77.
7. Смалянчук, А. Краёвец Антон Луцкевіч [Электронны рэсурс] / А. Смалянчук // Рэжм доступу: http://bk.baj.by/lekcyji/historyja/smalanczuk_04-05.htm. – Дата доступу: 27.04.2014.
8. Хомич, С. Территория и государственные границы Беларуси в ХХ веке. От незавершенной этнической самоидентификации и внешнеполитического произвола к современному status quo / С. Хомич. – Минск : Экономпресс, 2011. – 416 с.
9. Шыбека, З. Нарыс гісторыі Беларусі (1795–2002) / З. Шыбека. – Мінск : Энцклапедыкс, 2003. – 490 с.
10. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. У 2 кн. – Кн. 1 / А. А. Каваленя [і інш.] ; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Бел. навука, 2011. – 584 с.
11. Василевский (Плохоцкий), Л. Современная Польша и ее политические стремления / Л Василевский. – СПб. : Тип. общ-ва «Общественная польза», 1906. – 220 с.
12. Wasilewski, L. Kresy wschodnie. Litwa i Białorus – Podliasie i Chelmszczyzna. Galicya wshodnia – Ukraina / L. Wasilewski. – Warszawa–Kraków : Towarzystwo Wydawnicze w Warszawie, 1917. – VII, 109 s.
13. Wasilewski, L. Dzieje zjazdu paryskiego 1892 roku. Przyczynek do historji polskiego ruchu socjalistycznego / L. Wasilewski. –Warszawa : Wydawnictwo Instytutu Badania Najnowszej Historji Polski, 1934. – 48 s.
14. Wielhorski, W. Litwa etnograficzna. Przyroda, jako podstawa gospodarcza. Rozwój stosunków narodowościowych / W. Wielhorski. – Wilno : Wydawnictwo Wileńskiego Biura Informacyjnego, 1928. – 218 s.
15. Wielhorski, W. Litwa współczesna / W. Wielhorski. – Warszawa : Wojskowy Instytut Geograficzny, 1938. – 254 s.
16. Grunberg, K. Polskie koncepcje federalistyczne 1864–1918 / K. Grunberg. – Warszawa : Książka i Wiedza, 1971. – 358 s.
17. Laniec, S. Białoruś w dobie kryzysu społeczno-polityznego (1900–1914) / S. Laniec. – Olsztyn : Druk : Wyższa Szkoła Pedagogiczna w Ołsztynie, 1993. – 135 s.
18. Pajewski, J. Odbudowa Państwa Polskiego. 1914–1918 / J. Pajewski. – Poznań : Wydawnictwo Poznańskie, 2005. – 354 s.
19. Miknys, R. Wileńscy autonomiści i ich projekty autonomii politycznej Litwy w latach 1904–1905 / R. Miknys // Lithuano-Slavica Poznaniensia Studia Historica. – 2001. – T. VIII. – S. 97–112.
20. Marozau, S. Знішчэнне Вялікага княства Літоўскага як сацыякультурная траўма / S. Marozau // Per aspera ad astra : Materiały z XVI Ogólnopolskiego Zjazdu Historyków Studentów. – T. XII: Metodologia historii, historiografia i historia gender / Red. A. Swiątek. – Kraków : Uniwersytet Jagiellonski, 2008. – S. 101–113.
21. Марозаў С. П. Тэорыя сацыякультурнай траўмы П. Штомпка як тэарэтыка-метадалагічная аснова вывучэння ідэй і праектаў адраджэння Вялікага Княства Літоўскага / Шлях у навуку : зб. арт. да 55-годдзя студ. навук.-дaслед. гіст.-краязн. гутрка “НіКа” / ГрДУ імя Я. Купалы ; рэдкал.: Н. А. Івашчанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Гродна : ГрДУ, 2011. – 281 с. – С. 186–193.
22. Луцкевіч, А. Рэфэрат Беларускае дэлегацыі на Лязанскай канфэрэнцыі народаў Расеі / А. Луцкевіч // Барацьба за вызваленне / Уклад., навук. рэд., пер., камент. і прадм. А. Сідарэвіча. – Вільня : Ін-т беларусістыкі ; Беласток : Бел. гіс. тав-ва, 2009. – С. 121–124.
23. Луцкевіч, А. Уваскросшы праект (аб беларуска-ўкраінска-літоўскім саюзе) // А. Луцкевіч. Барацьба за вызваленне / Уклад., навук. рэд., пер., камент. і прадмова А. Сідарэвіча. – Вільня : Ін-т беларусістыкі; Беласток : Бел. гіс. тав-ва, 2009. – С. 318–320.
24. Kalinowski, W. Kwestja Wschodnia a Białoruś / W. Kalinowski. – Warszawa : Drukarnia Literacka, 1920. – 14 s.
25. Dmowski, R. Polityka polska i odbudowanie pańswa / R. Dmowski. – Warszawa : Instytut Wydawniczy Pax, 1989. – T. 2. – 346 s.
26. Kulczycki, L. Państwa centralne, Rosya a Polska / L. Kulczycki. – Kraków : Drukarnia Narodowa, 1916. – 68 s.
27. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. – Ф. 3. – Воп. 1. – Спр. 145. Т. Грыб. “Нашы мэты і заданні”. Артыкул без канца. Машынапіс.

28. Bielskis, J. J. Lithuania. Facts Supporting Her Claim for Reestablishment as an Independent Nation / J. J. Bielskis. – Washington : The Lithuanian National Council. – [Б.г.]. – 48 p.
29. Lichtensztul, J. The White Ruthenian Problem in Eastern Europe / J. Lichtensztul. – Reprinted from the Quarterly Bulletin of the Polish Institute of Arts and Sciences in America. – 1944. – July. – 28 p.
30. Sopycki, S. Eastern Poland / S. Sopycki. – London : “Verytas” Foundation Press, 1965. – 35 s.
31. Кароткі нарыс беларускага пытаньня. – Мінск : Выдавец І. П. Логвінаў, 2009. – 396 с.
32. Бібліятэка Акадэміі навук Літвы, аддзел рукапісаў. – Ф. 21-276. Пратаколы беларускіх арганізацый. 1916 г. – 36 л.
33. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. – Ф. 102 Дэпартамент паліцыі. Агляды. – Воп. 253. – Спр. 120.
34. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. – Ф. 102 Дэпартамент паліцыі. Агляды. – Воп. 253. – Спр. 142.
35. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. – Ф. 579 Мілюкоў П. Н. – Воп. 1. – Спр. 1842.
36. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. – Ф. 586 Плеве В. К. – Воп. 1. – Спр. 194.
37. Z Rosja czy przeciw Rosji? – Warszawa : Spółka Wydawnicza „Odrodzenie“, 1916 . – 119 s.
38. Рудовіч, С.С. Вайна, палітыка, штодзённасць вачыма мастака-краёўца (“Дзённік” Фердынанда Рушчыца як крыніца па гісторыі Першай сусветнай вайны) / С.С. Рудовіч // Беларусь у гады Першай сусветнай вайны. Смаргоншчына: трагедыя, гераізм, памяць : матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф., Смаргонь, 18–19 мая 2007 г. / навук. рэд. А. М. Літвін, У. В. Ляхоўскі; рэдкал.: М. У. Мясніковіч [і інш.]. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2000. – С. 220–242.
39. Skirmumtowna, K. Stronnictwo Krajowe Litwy i Białejrusi / K. Skirmumtowna // Kurier Litewski. – 1907. – 3 (16) maja. – 18 s. [Асобны адбітак].
40. Щавлинский, Н. Б. Государственно-политическое и национально-культурное самоопределение Беларуси в годы Первой мировой войны (1914–1918) / Н. Б. Щавлинский. – Минск : ООО «Мэджик Бук», 2009. – 192 с.
41. Krajewski, Z. Geneza i dzieje wewnętrzne Litwy Środkowej (1920–1922) / Z. Krajewski. – Lublin : Ośrodek Studiów Polonijnych i Społecznych PZKS w Lublinie, 1996. – 172 s.

*Паступіў 01.04.2015*

## STATE-POLITICAL TRADITION OF GRAND DUCHY OF LITHUANIA IN NATIONAL MOVEMENTS OF ITS SUCCESSORS IN EARLY XX CENTURY

***S. MAROZAU***

*It is reviewed the search in early XX century by Belarusian, Lithuanian and Polish political thought of the forms of national-state structure of the peoples of former Grand Duchy of Lithuania (GDL) on the basis of its state-political tradition. It is established the circumstances of appeal to historical tradition. Article describes the role and place GDL tradition in «krajovaya» ideology, in ideology of Lithuanian autonomists, Polish federalists, Belarusian national movement. It is shown how the divergence of nation interests lead to adapt GDL heritage to them and to the competition because of this heritage.*

*Scientific novelty lies in methodological approach, based on modern concepts (sociocultural trauma; political nation; creation of nations in Eastern Europe, discussed on the phenomenon of Rzeczpospolita and GDL heritage); in comparative analysis of use of GDL heritage by Belarusian, Lithuanian and Polish national movements and show the specificity of ideology of Belarusian movement; attract new archival sources.*